СПИСОК ИСПОЛЬЗОВАННЫХ ИСТОЧНКОВ

1. Богданов, И. А., Виноградский, И.А. Драматургия эстрадного представления: учебник – СПб / И.А. Богданов, И.А. Виноградский. – СПб ГАТИ, 2009. – 424 с.

2. Рашидов Т.М. Синтез искусств в контексте эстрадного представления: автореф. … дис. канд. искусствовед. : 17.00.09 / Т.М. Рашидов; гос. ин-т иск. Узбек. – Т., 2011. – 32 с.

3. Шароев, И.Г. Режиссура эстрады и массовых представлений / И.Г. Шароев.- М. : Просвещение, 1986. – 364 с.

4. Яшкин, В.К. Театральность и театрализация в искусстве советской эстрады (к проблеме обогащения музыкальной эстрады средствами театра): автореф. дис. … канд. искусствовед. : 17.00.01 / В.К. Яшкин; Всесоюзн. научно- исслед. ин-т искусствовед. – 1986. – 22с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Бруевич О.А., студент 450 группы
дневнй формы обучения
Научный руководитель – Герасимѐнок Д.В.,
кандидат культурологии, заведующий кафедрой

## ГАБРЭЙСКІЯ МОГІЛКІ БЕЛАРУСІ ЯК АБ’ЕКТ ТУРЫСТЫЧНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ

Першыя дакументальна зафіксаваныя звесткі аб прысутнасці габрэяў на тэрыторыі Беларусі адносяцца да часоў вялікага князя Вітаўта і звязаны са з’яўленнем габрэйскіх абшчын ў Брэсце (1388) і Гродне (1389). Паступовае рассяленне габрэяў на беларускіх землях сфарміравала ўнікальны пласт непаўторнай культуры і традыцый, што адпаведным чынам зафіксавалася ў матэрыяльнай і духоўнай спадчыне краіны.

Пачынаючы з другой паловы ХХ ст. аб’екты габрэйскай культуры ўсѐ

часцей разглядаюцца і прызнаюцца міжнароднай супольнасцю як важны элемент агульнай транснацыянальнай спадчыны. Сярод такіх аб’ектаў пераважаюць габрэйскія могілкі альбо іх рэшткі, якія нярэдка з’яўляюцца апошнім напамінам аб габрэйскай прысутнасці на беларускіх землях. Невыпадкова сучаснае грамадства надае вялікую ўвагу вывучэнню габрэйскіх могілак, нанясѐнні іх на турыстычныя мапы як важнай частцы працэсу па актуалізацыі спадчыны і яе трансляцыі будучым пакаленням.

Пры дэталѐвым разглядзе стану захаванасці габрэйскіх могілак атрымоўваецца наступная карціна: 73 з 401 выяўленага пахавання могуць лічыцца ахоўнымі і не патрабуюць тэрміновых работ па аднаўленні, з іх толькі гістарычная частка габрэйскіх могілак у г. Магілѐве атрымала статус «гісторыка-мемарыяльнага месца пахавання». Паводле апытання, праведзенага ESJF (Еўрапейская ініцыятыва па габрэйскіх могілках), 67 могілак апынуліся пад тэрміновай і непасрэднай пагрозай знікнення, 49 – знішчаны і не адноўлены па сѐнняшні час, 23 – цалкам страчаны [4].

У выніку абыякавых адносін да габрэйскіх могілак як аб’ектаў культурнай спадчыны амаль палова існуючых пахаванняў знаходзяцца ў занядбаным стане. Да найбольш абуральных прыкладаў можна прывесці сітуацыю ў г.п. Лынтупы, аг. Будслаў, г. Быхаў, аг. Грозава і г. д., дзе могілкі фактычна не прыбіраюцца, а надмагіллі раскрадаюцца пад гаспадарчыя патрэбы. Падобная з’ява адбылася і з пахаваннямі ў г. Паставы, якія з-за месцазнаходжання ў межах горада і пры неабходным доглядзе магчыма было б дэманстраваць турыстам [4].

Нажаль, габрэйская культура не заўсѐды ўспрымаецца грамадствам як частка айчыннай гісторыі, нярэдка на могілкі звяртаецца увага толькі пры наяўнасці ў іх спецыяльнага статуса з ахоўнай шыльдай. Дадзеная акалічнасць негатыўна уплывае і на турыстычны патэнцыял невялічкіх мястэчкаў, дзе не захаваліся іншых аб’ектаў габрэйскай спадчыны і могілкі з’яўляюцца адзіным напамінам аб прысутнасці габрэяў. Уключэнне габрэйскіх пахаванняў у турыстычныя маршруты адкрывае, напэўна, адзіны

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

шлях да іх захавання.

Варта адзначыць, што некаторыя габрэйскія пахаванні сталі сапраўднымі пярлінамі на турыстычнай мапе Беларусі. Карыстаецца папулярнасцю маршрут «Валожын – Іўе – Радунь», асобныя кропкі – аг. Друя і Індура, г.п. Бешанковічы, г. Гродна і інш. Напрыклад, у г. Гродна рэлігійныя групы наведваюць сінагогу, гета, занѐманскія могілкі, дзе пахаваны мясцовы цадзік (праведнік). Там яны трымаюць малітву, часам вельмі доўгую. Некаторыя турысты прыязджаюць, каб ўшанаваць памяць продкаў ці проста зрабіць фотаздымак. Неўзабаве, у Беларусі існуюць месцы, важныя для ўсяго габрэйскага свету, да прыкладу, рабіна і філосафа Хафеца Хаіма ў г.п. Радунь [3].

Мэтанакіраваную працу па ўключэнні габрэйскіх могілак ў аг. Ленін і в. Ізабелін у турыстычную дзейнасць вядзе Таварыства аховы помнікаў гісторыі і культуры Беларусі (далей – Таварыства аховы помнікаў). Так, на тэрыторыі аг. Ленін знаходзяцца ўнікальныя драўляныя мацэ(й)вы (надгробкі), што захаваліся толькі ў двух месцах ва ўсім свеце: у згаданым вышэй беларускім аграгарадку і ў г. Унеча (Расійская Федэрацыя). Могілкі знаходяцца ў адносна добрым стане, час ад часу іх наведваюць выпадковыя вандроўнікі, але, відавочна, пахаванні не з’яўляюцца буйной турыстычнай кропкай на мапе падарожжаў. Зыгодзячы з гэтага, члены Таварыства аховы помнікаў вырашылі пачаць з базавых рэчаў, а менавіта са стварэння лапідарыя, кансервацыі і каталагізацыі. У перспектыве пахаванні можна ўключыць ў тур «Мінск – Слуцк – Давід-Гарадок – Столін», які вельмі добра яднае габрэйская тэма.

З в. Ізабелін іншая сітуацыя. Могілкі не маюць статуса пахавання, знаходзяцца ў межах калгаснага поля, кепска вывучаны, але дзякуючы комплекснаму падыходу Таварыства аховы помнікаў вяртаюцца да жыцця і могуць стаць аб’ектам турыстычнай прывабнасці. Мястэчку пашанцавала знаходзіцца непадалѐк ад аг. Падароск, у якім па цяперашні час аднаўляецца сядзібна-паркавы комплекс Чачотаў-Бохвіцаў. У перспектыве в. Ізабелін,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

адпаведна і могілкі, можа стаць адным з цэнтраў турыстычнага кластэра «Ваўкавыск – Падароск – Ружаны».

На думку Паўла Падкарытава, уладальніка прыватнага турыстычнага ўнітарнага прадпрыемства «Маѐнтка Падароск», в. Ізабелін мае ўсе магчымасці стаць цікавай кропкай на мапе Беларусі. Прадугледжваецца магчымасць ўключэння могілак у сацыяльна-культурны кантэкст рэгіѐна праз арыентацыю грамадскай супольнасці на захаванне мясцовай спадчыны, яе прэзентацыю сродкамі турыстычнай дзейнасці [2]. Відавочна, што для наведвальнікаў неабходна стварыць адпаведныя ўмовы: аднавіць агароджу, адрэстаўраваць браму і надмагіллі. Акрамя таго, кіраўніцтва «Маѐнтка Падароск» бача патрэбу ў рэканструкцыі і аднаўленні гістарычнага знешняга выгляду будынка сінагогі, які будзе прыстасаваны пад турыстычныя патрэбы.

Летам 2021 г. мястэчка Ізабелін стала часткай праекта «Shtetlfest», накіраванага на абмен вопытам актуалізацыі культурнай спадчынай былых штэтлаў. Вѐска увайшла ў міжнародны маршрут, у межах якога адбылася экспедыцыя, арганізаваны першыя экскурсіі, часткай якіх сталі і могілкі. Несумненна, што мясцовыя габрэйскія пахаванні ў хуткім часе стануць важнай часткай турыстычных маршрутаў Ваўкавыскага раѐна.

Спрыяльна сітуацыя складаецца вакол пахаванняў у г. Валожын, дзе плануецца стварэнне габрэйскага цэнтра, рэканструкцыя знакамітай ешывы «Эц Хаім» XIX ст., якая прыцягвае рэлігійныя групы габрэяў з розных кропак свету. Мясцовыя ўлады працуюць у накірунку ўстойлівага развіцця рэгіянальнага турызму і разглядаюць аб’екты габрэйскай спадчыны, у тым ліку і могілкі, у якасці патэнцыйных месцаў наведвання.

Абраныя прыклады не адзіныя. На тэрыторыі Беларусі больш за 180 габрэйскіх пахаванняў могуць зацікавіць турыстаў. Гэта і могілкі ў г.п. Сапоцкін з так званымі ―пахаваннямі XIII стагоддзя”, самыя буйныя могілкі Беларусі ў г.п. Бешанковічы, звязаныя з асобай Саламона Юдовіна, Шклоўскія могілкі з рытуальным ―чысцілішчам” і шмат іншых цікавых
РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

кропак.

Праектам, які яднае турызм і габрэйскія могілкі, з’яўляецца «M.E.G.A.» (Памяць. Адукацыя. Пакаленне. Дзеянне) міжнароднай габрэйскай арганізацыі Hillel. Гэта ініцыятыва па захаванню і вывучэнню габрэйскіх могілак, у межах якой уваходзіць падарожжа па Беларусі з наведваннем турыстычных атракцый, памятных для кожнага яўрэя месцаў, знаѐмства з рабінамі – прадстаўнікамі розных напрамкаў іўдаізма, рознымі мерапрыемствамі з габрэйскай спецыфікай і г. д. Маршрут праекта выглядае наступным чынам: «Мінск – Косава – Брэст – Пінск – Давыд-Гарадок – Слуцк – Капыль – Мінск». У межах падарожжа акрамя могілак удзельнікі наведаюць замкі і музеі, месцы знішчэння габрэяў, памятныя знакі, мемарыяльныя комплексы, сінагогі і былыя габрэйскія дамы [5].

Відавочна, што габрэйскія могілкі Беларусі маюць выключны патэнцыял для развіцця турызму, застаецца пытанне аб правільнай іх адаптацыі пад патрэбы турысцка-экскурсійнай дзейнасці. Турыстычная кампанія Jewish Tour Agency з’яўляецца ўдалым прыкладам па арганізацыі ўязнога турызму, накіраванага, перш за ўсѐ, на наведванне мясцін, звязаных з гісторыяй, рэлігіяй і культурай габрэяў Беларусі. Агенцтва прапаноўвае камфортныя ўмовы для рэлігійных груп – кашэрнае харчаванне, правядзенне Шабату, прадастаўленне гідаў з веданнем іўрыту або ідышу, усіх аспектаў рэлігійнага ладу жыцця і г. д.

Па словах Яўгена Махліна-Ткачэнка, кіраўніка Jewish Tour Agency, абслугоўваць габрэйскія рэлігійныя групы складана: у гэтай катэгорыі турыстаў строгі кашруд, гэта значыць асаблівыя патрабаванні да размяшчэння і харчавання, гідаў і г. д. Для нерэлігійных груп сярод галоўных праблем, якія перашкаджаюць развіццю турызму, застаюцца падазронае стаўленне да Беларусі, прысутнасць некаторых стэрэатыпаў, закінутасць многіх аб’ектаў і недахоп адпаведна падрыхтаваных кадраў [1].

Падсумаваўшы ўсе сказанае вышэй, можна прыйсці да высновы, што праз габрэйскія пахаванні транслюецца непаўторная самабытнасць культуры

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

і гісторыі Беларусі. Вельмі важна захаваць дадзеную шматграннасць для самых розных наведвальнікаў з дапамогай турыстычнай дзейнасці. Падчас працы на базе габрэйскіх могілак важна памятаць аб неабходнасці збалансаваць перакананні і веру пахаваных з поглядамі сучаснага грамадства, бо могілкі традыцыйна не прызначаліся для турызму. Таму ператварэнне іх у турыстычныя аб’екты – гэта далікатны працэс трансфармацыі, балансу паміж рэлігійнымі прадпісаннямі і простай цікаўнасцю з боку наведвальнікаў.

СПІС ВЫКАРЫСТАНЫХ КРЫНІЦ

1. В Минске прошла дискуссия по развитию еврейского туризма в Беларуси: потенциал большой, но в полной мере не используется [Электронный ресурс] // TIO.by. – Режим доступа: https://www.tio.by/info/turbiznes/v-minske-proshla-diskussiya-po-razvitiyu-evrejskogo-turizma-v-belarusi-potencial-bolshoj-no--v-polnoj-mere-ne-ispolzuetsya/. – Дата доступа: 11.03.2022.

2. Ізабелін [Электронны рэсурс] // Слова Жыцця. – Рэжым доступа: http://slowo.grodnensis.by/index.php?option=com_content&view=article&id=3280%3A12-399&catid=12%3Aparafii-i-swiatynie&Itemid=430&lang=by. – Дата доступа: 13.03.2022.

3. Яны вяртаюцца. Якую Беларусь шукаюць габрэйскія турысты? [Электронны рэсурс] // Планета Беларусь. – Рэжым доступа: https://planetabelarus.by/publications/yany-vyartayutstsa-yakuyu-belarus-shukayuts-gabreyskiya-turysty-/. – Дата доступа: 07.03.2022.

4. Belarus Jewish Cemeteries Survey and Research Project Report [Electronic resource] // European Jewish Cemeteries Initiative. – Mode of access: https://www.esjf-cemeteries.org/wp-content/uploads/2019/06/book7_read.compressed.pdf. – Date of access: 08.03.2022.

5. M. E. G. A. [Электронны рэсурс] // Hillel. – Рэжым доступа: https://www.hillel.su/projects/mega. – Дата доступа: 09.03.2022.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ